# Фонд універсальнага абслугоўвання

На 2025 год, у адпаведнасці з артыкулам 8 **Закона Рэспублікі Беларусь ад 13 снежня 2024 г. № 48-З** «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2025 год», зацверджаны:

даходы рэспубліканскага фонду ўніверсальнага абслугоўвання лічбавага развіцця і сувязі ў суме 69 000 000,0 руб.;

выдаткі рэспубліканскага фонду ўніверсальнага абслугоўвання лічбавага развіцця і сувязі ў суме 69 000 000,0 руб.

У 2025 годзе сродкі фонду плануецца накіраваць на:

1. мерапрыемствы Дзяржаўнай праграмы «Лічбавае развіццё Беларусі» на 2021-2025 гады, у тым ліку:

у суме 4 000 000,0 руб. на капітальныя ўкладанні, звязаныя з развіццём інфраструктуры сетак электрасувязі, якія выкарыстоўваюцца для аказання паслуг электрасувязі агульнага карыстання, прадастаўленне якіх дзяржава гарантуе ўсім карыстальнікам паслуг электрасувязі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь па даступных тарыфах, і накіроўваюцца на новае будаўніцтва, рэканструкцыю, пашырэнне і тэхнічнае пераабсталяванне праектнай дакументацыі), а таксама на набыццё абсталявання, якое не ўваходзіць у каштарысы на будаўніцтва;

у суме 62 418 470,0 руб. на дзяржаўныя праграмы ў сферы лічбавага развіцця (іх падпраграмы), у рамках якіх ажыццяўляюцца навукова-даследчыя, даследна-канструктарскія і даследна-тэхналагічныя работы; капітальныя ўкладанні ў асноўныя фонды; набыццё нематэрыяльных актываў;

у суме 2 581 530,0 руб. на фінансаванне расходаў рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства «Цэнтр лічбавага развіцця» і Цэнтра перспектыўных даследаванняў у сферы лічбавага развіцця адкрытага акцыянернага таварыства «Гіпрасувязь», звязаных з ажыццяўленнем функцый, якія выконваюцца імі ў адпаведнасці з падпунктам 6.2 пункта 6 і пункта 7 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 красавіка 2022 г. № 136 «Аб органе дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавага развіцця і пытаннях інфарматызацыі».

Парадак фарміравання і выкарыстання сродкаў рэспубліканскага фонду ўніверсальнага абслугоўвання лічбавага развіцця і сувязі зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 студзеня 2020 г. № 13 «Аб рэспубліканскім фондзе ўніверсальнага абслугоўвання лічбавага развіцця і сувязі».

Палажэнне аб парадку фарміравання і выкарыстання сродкаў рэспубліканскага фонду універсальнага абслугоўвання сувязі і інфарматызацыі

Рэквізіты для выплаты адлічэнняў у рэспубліканскі фонд універсальнага абслугоўвання сувязі і інфарматызацыі

Бюджэт фонду

Форма ведамаснай справаздачнасці

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/fond-universalnaga-abslugouvannya*